**Слова Госпада за пакуты, хваробы...**

Дзеці мае дарагія!

Вы, каторыя пакутуеце ў гэтую хвіліну, − як блізкія Вы майму Сэрцу.

Я хачу, каб вы ведалі, што чалавечыя пакуты кранаюць Мяне і прымушаюць прымкнуць вока на ўсе Вашыя віны, памылкі і хібы. Калі чалавек у болю, трывозе і пакутах звяртаецца да Мяне, тады Я, Гаcподзь ваш, Айцец і Збавіцель, Бог бясконцай велічы і сілы, адразу кідаюся да свайго дзіцяці, каб быць з ім, дапамагчы яму і супакоіць яго. Ні адна маці не кахае вас мацней, не клапоціцца пра вас болей і не абараняе вас старанней, чым я, Ісус – ваш сябар, бо толькі Я аддаў сваё жыццё і заплаціў за ваша збавенне ўласнымі пакутамі. Я ведаю, што значыцца боль цела чалавека, яго страхі і трывога прадчування. У ноч гефсіманскіх выпрабаванняў я не толькі перажыў сваю будучую пакуту, але і сустрэў вашу няўдзячнасць, вашу будучую чэрствасць, нянавісць да мяне, адмову Маёй Ахвяры – з боку тых, хто будзе рабіць гэта пазней на працягу тысяч гадоў. І, нягледзячы на гэта, я не адступіўся, таму што мая любоў да вас мацнейшая за ўсялякія вашыя цяперашнія і будучыя віны, яна была і застаецца бясконцая.

Я хачу, каб вы скарысталі з часу міласэрнасці, які я даю вам. Гэта дар братэрства. Калі вы складаеце са мной, Ісусам Хрыстом, Збавіцелем вашым, братэрства ў пакутах і яднаеце яго з маёй крыжовай Ахвярай, нават калі пакуты былі дробнымі і малаістотнымі ў параўнанні з жудаснай смерцю ўкрыжаванага, адпакутаваўшага духоўна і фізічна Богачалавека, братэрства гэтае доўжыцца будзе ў вечнасці, ахоўваць будзе вас на справядлівым судзе Божым у бляску бясконцай святасці Святой Тройцы.

Бо ніколі не можа здарыцца так, каб Я, Бог Міласэрнасці, Уседаравальнай Любові, адмовіў таму, хто звяртаўся да мяне ў пакуце і трывозе. Таму карыстайцеся часам, які дараваны вам для таго, каб вы маглі знаходзіцца побач са мною, не баючыся за стан вашага духу, без сораму і трывогі − у вашых пакутах і грахах − перада Мной, лекарам вашых душ.

Маці не напамінае хвораму дзіцяці пра яго віны, нават калі дзіця было нядобрым, хлуслівым і дрэнна да яе ставілася. Дзіця пакутуе − і гэтага дастаткова, каб маці забылася пра ўсё, акрамя таго, што патрэбна яе дзіцяці. Гэтак жа, як і я.

Чым горш вы сябе пачуваеце, тым больш неабходным я для вас з'яўляюся, і калі толькі вашая воля скажа: "прыйдзі", я адразу апынуся і ўжо застануся побач з вамі. Мяне нічога не можа прымусіць адвярнуцца ад вас: ні ваш грэх, ні злосць, ні ранейшая нявера, нянавісць або абыякавасць. Я не хачу іх заўважаць ці ўспамінаць. Я толькі ведаю, што калі маё дзіця знаходзіцца ў небяспецы, калі яно самотнае, устрывожанае, бездапаможнае, калі яго сэрца плача, у мяне заўсёды маецца для яго спачуванне, пяшчота, дабрыня, разуменне і бясконцая цярплівасць. Таму не бойцеся Мяне, не пазбягайце. Я магу аблегчыць ваш боль, супакоіць вас і заспакоіць ваш эмацыянальны голад сваёй любоўю. Я магу ўсё. Я найлепшы лекар. Я хачу служыць вам сваёй сілай, адважнасцю, мужнасцю, сяброўствам, хачу запоўніць вашу адзіноту, даць вам надзею і ўпэўненасць у маёй любові. Калі я з вамі, адыходзіць любы страх.

Я так вам патрэбны, мае бедныя, разгубленыя, збалелыя і сумныя дзеці. Атрымлівайце асалоду ад пакутніцтва, часу ласкі і міласэрнасці, таму што гэты час напоўнены маімі падарункамі для вас, маёй літасцю.

Дзеці! Вам прысвечаны Сакрамент Хворых − мой акт прабачэння, які скрэслівае ўсе вашыя віны, асабліва ў дачыненні да вашых братоў. У ім я турбуюся пра свае абавязкі перад правасуддзем Айца і я заплачу Крывёю сваёй за вас, каб Вы маглі стаць вольнымі. І тады вы, ужо чыстыя і ўзрадаваныя, адразу можаце ўвайсці ў мой дом, які з'яўляецца паўнатой шчасця. Бо прагну я супакоіць ваш боль, напаіць вас любоўю, пазбавіць вас ад Чысца – часу сораму, душэўнага болю, жалю і пакуты. Кожнага з вас, хто пакутуе, я хацеў бы абняць і далікатна, калі той засне на маім сэрцы, перанесці праз парог смерці да майго Каралеўства. Са мной Чысцец не мае ніякай улады над вамі, няма ніякага страху ані жаху. Вы пераходзіце ад жыцця да Жыцця са Мной, у шчасце вечнай радасці. Я ніколі не пакіну таго, хто даверыўся мне. Але Я адначасова і лекар, таму Сакрамент Хворых можа стаць для вас шляхам да выздараўлення цела і лекам для душы вашай. Я сам выбіраю для вас самае лепшае – хто ж ведае і разумее кожнага з вас так, як я...? Таму баяцца Мяне ня трэба. Я жыццё ваша, Душа вашай душы. Я неабходны вам, таксама як целу неабходны святло і вада, паветра і кроў.

І вы, дзеці мае любыя, вы Мне патрэбны. Час пакут, час разгубленасці, страху і смутку – гэта час ласкі маёй. Ці ведаеце вы, што ў гэтыя хвіліны вы можаце мяне прасіць усё? Асабліва, калі вы просіце, яднаючы стан ваш са збавеннай пакутай маёй, бо тады мы разам просім Айца. Калі б вы разам са мной маліліся пра шчасце, мір і паяднанне для сусвету, вы маглі б іх выпрасіць для ўсяго чалавецтва... Я адчыняю сваё Сэрца бескарыснай просьбе слабога чалавека, што пакутуе, – такой просьбе я не магу супраціўляцца.

Звяртаюцца да мяне людзі, якія і да гэтага часу жывуць у грахах і брудзе і так рэдка просяць мяне пра сапраўднае дабро. Паглядзіце на зямлю. Яна ўся ў небяспецы. Усё яшчэ гінуць людзі, забітыя сваімі братамі, расце голад побач з абыякавасцю сытых, расце колькасць злачынстваў, псотаў, пачварства, усе больш прыкладаў дэвіяцыі чалавечай псіхікі, з'яўляюцца новыя захворванні, новыя забруджванні, новыя прычыны для вайны і прычынення пакут самім сабе. А колькі зламаных сем'яў у вашай краіне? Колькі асірацелых і сумных дзяцей? І колькім з іх не было дадзена жыццё па віне бацькоў і сем'яў? Калі шалее алкагалізм, расце наркаманія, узаемная нянавісць, зайздрасць, прагнасць, эгаізм, лянота, інтрыгі...?

Я забіраю вас, дзеці, на некаторы час з атручанай прагнасцю атмасферы і гонкі за валоданнем, барацьбой за марныя і трывіяльныя рэчы, каб вы маглі ўбачыць іх мізэрнасць у параўнанні з адзінай істотнай справай – маёй барацьбой за вашае збавенне. Прашу вас, дапамажыце мне ў гэтым!

Я змагаюся за бясконцае шчасце для кожнага з вас. І ні адзін з вас не будзе менш каханым ад другога. У кожным з вас я люблю яго самога − тое, чым ён адрозніваецца ад іншых, і той любоўю, што дарue яму ўсе шансы выбраць лепшае для сябе. Выбраць тое, што зробіць яго шчаслівым не на момант, а шчаслівым на вечнасць. Я хачу, каб кожны з вас зразумеў, што ён з'яўляецца самым важным для мяне. Нават калі ён быў прызнаны непатрэбным, самотным, пакінутым, старым і бездапаможным, кім грэбуюць або пагарджаюць іншыя – я люблю яго, і люблю яго асабліва моцна, горача, і тым больш, чым менш чалавечага кахання ён атрымаў. Таму што кожны з вас атрымаў існаванне любові маёй, якая жадае адорваць і рабіць шчаслівымі. І я даў вам паўнату свабоды для таго, каб вы маглі па ўласнай волі выбраць жыццё, якога самі прагнеце – са Мной або вечнасць па-за Любоўю. Свет вас, людзі, падманвае, навакольнае асяроддзе так рэдка бывае шчырым, дапамагаючым, добрым. Усе вы раніцеся і пакутуеце, атрымліваеце балючы вопыт; вас пакідаюць, ашукваюць. Вашыя памылкі і віны з'яўляюцца часткай за ўсеагульную віну. Таму я так вам дапамагаю, так вас абараняю, закрываю і прагну жыць ў блізкім сяброўстве з кожным з вас − не асуджваю, а тлумачу. Вы ўсе такія кволыя, зменныя, схільныя да падзеннняў, і таму менавіта патрабуеце дапамогі маёй заўсёды, у кожным самым ціхім звароце да Мяне.

Але калі вы хварэееце, пакутуеце, калі вы збалелыя і бездапаможныя, тады я сам, не чакаючы вашай просьбы, акружаю вас сваёю апекай. Я дарую ўсё і магу бачыць толькі ваш дрэнны стан. І тады я прапаную вам час ласкі і міласэрнасці. А цяпер я прашу вас, тых, хто зразумее мой клопат пра чалавецтва. Не губляйцеся, не адмаўляйцеся ад майго падарунка. Станьце адзін за адным, аддавайце свае пакуты Мне – за тых, за каго жадаеце. Патрэб мноства. Уся зямля плача. Злітуйцеся над блукаючамі вашымі няшчаснымі братамі і маліцеся за іх, прыносьце ў ахвяру вашы штодзённыя пакуты за вашы сем'і, за лекараў і калег, за Касцёл, за Радзіму, за тых, што гінуць, за самотных і паміраючых ... – як вам падказвае сэрца.

Памаліцеся, таму што нікога і ніколі не выслухаюць так, як чалавека, што пакутуе. Хто ж мае столькі літасці, колькі вы? І хто можа мне дапамагчы, калі вы гэтага не зробіце? Маліцеся, мае каханыя дзеці, за сусвет, за вашых суседзяў, і тады Я ахіну тых, што просяць, і тых, за каго яны просяць, адной палымянай любоўю. Тады ніхто з вас не загіне і благаслаўляцца будзе тымі, хто набыў дзякуючы Любові Нябёсы.

Дапамажыце мне, дзеці, ратаваць свет!

*Ганна: Сведкі Божай Міласэрнасці (Anna: Świadkowie Bożego Miłosierdzia). Выдавецтва "WAM", Кракаў, 1995-2011 (Nihil Obstat), частка 2, стар. 247-251.* www.wydawnictwowam.pl
*Пераклад на беларускую мову: Ірына Шчэрбач-Абяжыньска.* www.e-anna.eu